УДК [94(476) +356.15(476) (091)] «1941/1944»: 930.2 (084.3)

*А.А. Лукашоў*

# ДЫСЛАКАЦЫЯ ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ БЕЛАРУСІ ЧАСОЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ НА КАРТАГРАФІЧНЫХ ДАКУМЕНТАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІВА

Аналізуецца крыніцазнаўчая каштоўнасць картаграфічных дакументаў па дыслакацыі партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 г., пералічаны асноўныя фонды, у якіх захоўваюцца артыфакты такога тыпу. Разглядаецца змест дыслакацыйных карт, якія складаліся ў аператыўным аддзеле Беларускага штаба партызанскага руху. Цытуюцца інструкцыі, якія распрацоўваліся ў Цэнтральным штабе партызанскага руху і ў якіх прыводзіцца сістэма ўмоўных знакаў, неабходных для складання дыслакацыйных карт. Даецца кароткая характарыстыка тыпаграфскіх карт, якія выкарыстоўваліся для нанясення на іх рукапіснай інфармацыі, звязанай з размяшчэннем партызанскіх сіл. Спіс літаратуры складаецца з 14 пунктаў.

## Уводзіны

Актуальным пытаннем вывучэння гісторыі партызанскага руху на Беларусі ў 1941–1944 гг. з'яўляецца даследаванне і апісанне раёнаў дыслакацыі партызанскіх фарміраванняў, ці, інакш кажучы, геаграфіі раёнаў базіравання партызан. Пад раёнам базіравання партызанскага атрада, брыгады альбо палка мы разумеем месца знаходжання яго стацыянарнага лагера, з сукупнасцю гаспадарчых службаў (і часта пабудоў), знаходжанне яго камандавання, у тым ліку штаба. Ад раёна базіравання неабходна адрозніваць пазіцыі баявых падраздзяленняў партызан напярэдадні, пад час ці пасля правядзення баявой аперацыі, а таксама ў ходзе забеспячэння баявой аховы месца дыслакацыі фарміравання. Карты, якія паказваюць пазіцыі падраздзяленняў, адносяцца да ліку баявых. Актуальнасць высвятлення месца базіравання атрада звязана з тым, што менавіта ў месцах базіравання была створана абсалютная большасць дакументаў, якія цяпер з'яўляюцца асноўнай крыніцай па гісторыі барацьбы супраць акупантаў за лініяй фронту.

Паколькі веданне месца дыслакацыі кожнага партызанскага атрада было неабходна для таго, каб падтрымліваць сувязь з ім, для каардынацыі стасункаў паміж атрадамі і планавання аперацый, то гэтаму пытанню надавалася значная ўвага ў кіруючых партызанскім рухам органах рознага ўзроўню. Так, у Беларускім штабе партызанскага руху (далей – БШПР) існаваў аператыўны адзел, у якім вялася дзяжурная карта, на якой пазначалася месца знаходжання кожнага атрада ці брыгады. Практыка няспыннага вядзення дзяжурнай карты адзначалася асобнымі аўтарамі мемуараў партызанскай барацьбы на Беларусі [1, с. 16, 19, 24; 2, с. 274]. Такім чынам, органам, які акумуляваў інфармацыю пра месцы дыслакацыі партызан на ўсёй тэрыторыі Беларусі, быў БШПР. І менавіта яго фонды (№ 1450) змяшчаюць найбольш поўныя сведкі па гэтай праблематыцы.

Акрамя таго, у фондах ЦК КП(б)Б маюцца 24 справы, якія цалкам складаюцца з картаграфічных дакументаў, частка з якіх паказваюць месцы дыслакацыі народных мсціўцаў. Дадзеныя карты фонду ЦК КП(б)Б паходзяць з БШПР, адкуль яны перадава-

Навуковы кіраўнік – В.М. Цемушаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

лiся загадчыку ваенным адзелам ЦК КП(б)Б. У Нацыянальным архіве захавалася некалькі такіх лістоў (адрасаваных на імя Прохарава) з паведамленнямі аб прэправаджэнні начальнікам аперадзела БШПР Брюханавым дыслакацыйных карт (маштабу 1:500 000)партызан Беларусі за 30.09.1943 г. і 1.11.1943 г. (маштабу 1:1 000 000) у Цэнтральны Камітэт [3].

Паколькі дыслакацыя партызанскіх фарміраванняў ў гады Вялікай Айчыннай вайны вызначалася высокай дынамікай, то для даследчыка важна мець інфармацыю аб месцах знаходжання таго ці іншага атрада за як мага больш кароткія прамежкі часу.

Сярод 369 спраў 24-га вопісу, абсалютная большасць якіх складаецца з адной карты, 327 адзінак захавання прадстаўлены картамі дыслакацыі, з якіх 38 – гэта карты дыслакацыі на ўсю тэрыторыю рэспублікі. Самая ранняя з гэтых карт паказвае дыслакацыю партызан Беларусі на 10 жніўня 1942 г., гэта значыць яшчэ да ўтварэння 9 верасня 1942 г. БШПР. Акрамя таго, дыслакацыйныя карты маюцца на 1.11.1942 г., 1.01.1943 г., 1.03.1943 г., 30.03.1943 г., 1.04.1943 г. (выпраўленая і дапоўненая 1.05.1943 г.), 25.05.1943 г., 1.06.1943 г., 22.06.1943 г. (выпраўленая і дапоўненая 5.07.1943 г.), 30.07.1943 г., 20.09.1943 г., верасень 1943 г., 30.09.1943 г., 1.10.1943 г., 10.10.1943 г., 20.20.1943 г., 1.11.1943 г., 10.11.1943 г., 20.11.1943 г., 25.11.1943 г., 20.12.1943 г., 1.01.1944 г., 10.02.1944 г., 1.03. 1944 г., 1.04. 1944 г., 20.04. 1944 г., 1.06. 1944 г., 22.06. 1944 г., 25.06. 1944 г., 1.07. 1944 г., 22.07. 1944 г.

На адзінаццаць зрэзаў часу маюцца карты дыслакацыі партызан Беларусі ў справах фонда 4п ЦК КП(б)Б. Прычым пяць з іх – на даты, на якія няма карт у вышэй разгледжаным фондзе БШПР: 31.08.1943 г., 18.09.1943 г., 10.12.1943 г., 20.02.1944 г., 1.05.1944 г. Дыслакацыйныя карты партыйнага архіва, створаныя на 1.01.1943 г., 1.04.1943, 30.07.1943 г., 10.02.1943 г., 1.03.1944 г., 1.04.1944 г., можна разглядаць як крыніцу, якая дубліруе адпаведныя карты фонда 1450.

Для картаграфічных дакументаў, створаных БШПР, характэрна высокая якасць выканання і адзінства ўмоўных знакаў. Усе дакументы такога тыпу намаляваны ад рукі тушшу і каляровымі алоўкамі на выдадзеных тыпаграфскім спосабам картах (за адзінкавымі выключэннямі). Карты дыслакацыі на ўсю тэрыторыю рэспублікі, якія маюцца ў фондзе, складзены на палітыка-адміністрацыйных картах БССР маштабу 1:1 000 000 альбо на тапаграфічных картах маштабу 1:500 000. Гэтыя параметры дыслакацыйных карт не выпадковыя, а былі прапісаны ў адпаведных інструкцыях, распрацаваных у Цэнтральным штабе партызанскага руху (далей – ЦШПР). Адзін з пунктаў «Указанняў па запаўненню форм № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7 табеля тэрміновых данясенняў» абавязвае рэгіянальныя штабы партызанскага руху «дыслакацыю партызанскіх атрадаў, брыгад, злучэнняў і груп прадстаўляць на карце 500 000 (БШПР на карце 1 000 000)». Тут таксама указваецца, што «поўная карта дыслакацыі [прадстаўляецца] ў ЦШПР да 25 числа кожнага месяца па стану на 20-е число справаздачнага месяца. Да 15-га числа па стану на 10 число справаздачнага месяца прадстаўляюцца толькі звесткі пра істотныя змены, якія адбыліся ў складзе атрадаў ці злучэнняў» [4, 5]. Тут маюцца на ўвазе карты маштабаў 1:500 000 (5 км у 1 см) і 1:1 000 000 (10 км у 1 см). Гэтая ж інструкцыя давала выявы сістэмы ўмоўных знакаў, якія было неабходна выкарыстоўваць для стварэння такіх карт.

Адной з тыповых з'яўляецца карта «Дыслакацыя партызанскіх атрадаў Беларусі на 1.11.43. Выпраўлена 20.11.43». Карта маштабу 1:1 000 000 мае легенду, у якой вылучаны такія пункты, як «партызанскія брыгады», «партызанскія атрады», «партызанскія атрады і брыгады, якія знаходзяцца ў дарозе», «пасадачныя пляцоўкі», «месцы выкідкі грузаў», «рацыі», «лінія фронту».

Побач з кожным значком атрада ці брыгады маецца подпіс прозвішча камандзіра, а ў некаторых выпадках замест прозвішча ўказана, ў гонар каго названы атрад (брыгада). Напрыклад, атрад «імя Жукава» ў раёне Чырвонай Слабады Мінскай вобласці. На поўдзень ад яго пазначаны атрад імя Лазо. Як выключэнне можна разглядаць нумарны подпіс «брыгада № 17» – менавіта так падпісана фарміраванне ў раёне Прапойска (Слаўгарада), камандзірам якога ўвесь час (жнівень–снежань 1943 г.) быў Н.І. Кітаеў. На момант складання гэтай карты частка дадзенай брыгады ўжо злучылася з Чырвонай арміяй [6, с. 571]. Пад прозвішчам камандзіра, у назоўніку дробу, пазначана колькасць байцоў у дадзеным фарміраванні. Прозвішча камандзіра брыгады (атрада) у такім выпадку будзе знаходзіцца ў лічніку дробу. Для брыгад указана і колькасць атрадаў, якія ўваходзяць у іх склад. Лічба колькасці атрадаў даецца перад колькасцю байцоў, ад якой яна адзяляецца рыскай. Напрыклад, надпіс «Лівенцаў/3-400» азначае 1-ю Бабруйскую брыгаду пад камандаваннем В.І. Лівенцава, якая складаецца з 3-х атрадаў агульнай колькасцю 400 байцоў. Падобны спосаб падпісання баявых фарміраванняў шырока ўжываецца як на дыслакацыйных, так і на разведвальных картах партызан. Заўважым, што прозвішчы камандзіраў на ўсіх картах дыслакацыйнай тэматыкі даны без ініцыялаў, што ў шэрагу выпадкаў патрабуе удакладненяў па даведніках, паколькі існуюць камандзіры-аднафамільцы. Акрамя таго, сустракаюцца памылкі ў напісанні прозвішчаў. Так, на карце «Схема перадыслакацыі партызанскіх злучэнняў Віцебскай і Мінскай абласцей ў Беластоцкую» (на самой карце назва адсутнічае) прозвішча камандзіра атрада «Бясстрашны» С.Ф. Бубіна двойчы напісана праз «е» – «Бубен» [7]. Трэба сказаць, што палкі, як асобны від арганізацыі партызанскага фарміравання, тут асобна не вылучаюцца. Палкі на гэтых картах пазначаны як брыгады (з той толькі розніцай, што без указання колькасці атрадаў, як у брыгадах). Акрамя таго, у асобных выпадках нанесены арганізатарскія группы, якія пазначаны як атрады [8; 9]. Не пазначаны на большасці такіх карт у якасці асобнага віда нагрузкі штабы злучэнняў. Выключэннем з’яўляюцца карты дыслакацыі партызан на 1.01.1944 г., 10.02.1944 г., 1.01.1944 г. і 1.04.1944 г. маштабу 1:1 000 000 і карта маштабу 1:500 000 на 1.1.1943, дзе месцы дыслакацыі партызанскіх злучэнняў пазначаны і вынесены ў легенду [9–11]. Некаторыя дыслакацыйныя карты (у прыватнасці, тыя, якія паказваюць стан на 1.03 і 1.04. 1944 г.) вылучаюцца яшчэ і тым, што на іх пазначаны аб’екты партызанскай інфраструктуры на тэрыторыі, якая кантралявалася савецкімі войскамі: БШПР у Гомелі, Апергрупа БШПР на Заходнім фронце (недалёка ад Смаленска), прадстаўніцтва БШПР на 1-м Прыбалтыйскім фронце (недалёка ад Невеля) [12]. Паказаны на савецкай тэрыторыі і шэраг аэрадромаў рознага падпарадкавання: грамадзянскага паветрана флоту і армейскай авіяцыі (з указаннем найменняў гэтых падраздзяленняў). Маюцца таксама і аэрадромы для прамежкавых пасадак, т. зв. аэрадромы «падскоку», размешчаныя на частцы СССР, якая кантралявалася савецкімі войскамі, але недалёка ад лініі фронту. Тое, што гэтыя дзве карты паказваюць аб’екты партызанскай інфраструктуры па абодва бакі фронту, дазваляе гісторыку магчымасць атрымаць больш поўнае ўяўленне пра сувязі барацьбітоў у тыле ворага з савецкім тылам.

Дыслакацыйныя карты подпісваліся такімі адказнымі асобамі, як намеснік начальніка БШПР І. Ганенка і начальнік аператыўнага адзела Бруханаў. Сярод выканаўцаў карт называюцца імёны тэхніка-картографа Петуховай і інжынера капітана А. Анішчанкі. Большасць пазначаных на карце пасадачных пляцовак і месцаў выкідкі грузаў пранумераваны. Але што азначаюць гэтыя нумары, на саміх картах не растлумачана. На некаторых картдакументах паказаны і працэс перадыслакацыі народных мсціўцаў. Партызанскія атрады і брыгады, якія знаходзіліся на той час ў дарозе, пазначаны з дапамогай стрэлак. У асобных выпадках гэтыя стрэлкі

паказваюць рух фарміравання па тэрыторыі Беларусі на працягу дзесяткаў кіламетраў, у іншых – кароценькія стрэлачкі пазначаюць толькі сам факт руху і агульны накірунак перамяшчэння атрада (брыгады).

Картаграфічныя дакументы па дыслакацыі, зробленыя на картаграфічнай аснове маштабу 1:500 000, па характары паказу спецыяльнага зместу падобныя на дакументы, зробленыя на картаснове маштабу 1:1 000 000. На некаторых картах у якасці своеасаблівага дадатку пазначаны і іншыя з'явы партызанскага руху. Так, на карце «Дыслакацыя партызанскіх атрадаў Беларусі на 20.11.43 (без атрадаў, прызначаных для перадыслакацыі ў Заходнія вобласці)» асобна вылучаны «брыгады, прызначаныя для перадыслакацыі ў новыя раёны дзеяння». Карычневым алоўкам на гэтай карце абведзены шэраг тэрыторый. Што азначана такім спосабам, у легендзе карты не растлумачана, але аналіз дакумента дазваляе меркаваць, што гэта граніцы тэрыторый, кантралюемых партызанамі.

На картах дыслакацыі, якія адлюстроўваюць сітуацыю, што склалася пасля перадыслакацыі шэрагу злучэнняў у Заходнюю Беларусь, у тым ліку на картах, створаных у першай палове 1944 г., добра бачна, што на тэрыторыі Беластоцкай вобласці партызанскія атрады, а тым больш брыгады, ніколі не базіраваліся. Не пазначана на тэрыторыі Беласточчыны і партызанскіх пасадачных пляцовак і месцаў выкідкі грузаў [12]. На карце дыслакацыі партызан 10 снежня 1943 г. пазначаны толькі асобныя арганізатарскія групы П.Р. Бастуна і І.М. Аўсейчыка ў Скідзельскім раёне, што на паўночным усходзе Беласточчыны [13].

У фондах БШПР ёсць дыслакацыйныя карты, якія паказваюць партызанскі рух на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза. Адным з такіх дакументаў з'яўляецца карта маштабу 1:2 500 000 без легенды, назвы, подпісаў і дат [14]. Аднак на карце прысутнічае лінія фронту, канфігурацыя якой адпавядае становішчу на савецка-германскім фронце ў чэрвені – пачатку ліпеня 1942 г. На дакуменце пры дапамозе кружочкаў (якімі звычайна на дыслакацыйных картах паказваюць асобныя партызанчкія атрады) і трохвугольнікаў (якімі згодна з «Указаннямі па запаўненню форм № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7 «Табеля тэрміновых данясенняў» трэба маляваць дыверсійныя групы) паказаны партызанскія фарміраванні. Для шэрагу атрадаў і груп на карце паказана наяўнасць рацыі (пры дапамозе ўмоўных знакаў, дызайн якіх змешчаны ў тых жа ўказаннях). Аднак абсалютная большасць гэтых значкоў не падпісана. Чырвоным контурам на акупіраванай тэрыторыі СССР выдзелены тэрыторыі нявызначанага ў легендзе зместу, але відавочна звязаныя з дзейнасцю партызан. Такіх контураў на захопленай ворагам частцы Савецкага Саюза ўсяго пазначана 5, два з іх – на тэрыторыі Беларусі; гэтыя контуры дапоўнены подпісамі. Адзін з такіх контураў, які агароджвае даволі значную тэрыторыю ў міжрэччы Дняпра і Друці на ўсходзе Магілёўшчыны мае подпіс «Атр. імя Сталіна да 2500 б». У межах гэтага контура пазначана і дыверсійная група з рацыяй. Відавочна, тут маецца на ўвазе 208 атрад імя Сталіна, аднак гэтае фарміраванне ніколі не налічвала 2 500 байцоў. Дадзеная лічба, хутчэй за ўсё, азначае колькасць партызан усіх атрадаў, падначаленых Клічаўскаму аперцэнтру, які быў створаны і ўзначалены камандаваннем 208-га атрада; ў ліпені 1942 г. яго дзейнасць была санкцыянавана Ваенным саветам Заходняга фронту. Другі такі контур займае яшчэ большую тэрыторыю на мяжы Палескай, Мінскай і Магілёўскай абласцей. На тэрыторыі, ахопленай гэтым контурам, апынуліся не толькі такія пасёлкі, як Глуск і Петрыкаў, але нават Бабруйск; пазначана 4 дыверсійныя групы з рацыямі, маецца подпіс: «Гр. Мазурава 25 атр. да 4000 б.». Гэты подпіс, відавочна, азначае прысутнасць у партызанскіх фарміраваннях раёна прадстаўніка ЦШПР К.Т. Мазурава, якога кіраўніцтва партызанскім рухам у верасні 1942 г. накіравала праз лінію фронта і якога, думаецца, разглядала як старшага ў дадзенай групіроўцы.

З усяго сказанага можна заключыць, што гэта карта была створана не раней верасня 1942 г., а канфігурацыя лініі фронту на ёй складзена на больш раннюю дату, чым асноўны змест дакумента. Дадзеная карта была створана ва ўмовах, калі кіраўніцтва партызанскім рухам на савецкай тэрыторыі толькі яшчэ фарміравала свае ўяўленні пра абстаноўку за лініяй фронту, і частка інфармацыі, якой яно валодала, была даволі прыблізнай.

Практычна ўсе карты па дыслакацыі партызан на тэрыторыі Беларусі змяшчаюць інфармацыю і пра дыслакацыю радыёсувязі. Фактычна, наяўнасць радыёсувязі ў партызанскім атрадзе ці брыгадзе з'яўлялася адной з асноўных характарыстык фарміравання (разам з прозвішчам камандзіра і колькасцю байцоў), таму такія атрады на картах пазначаліся адпаведным значком.

**Заключэнне**

Карты дыслакацыі народных мсціўцаў у фондах БШПР даюць падрабязную інфармацыю пра рост колькасці партызанскіх сіл за перыяд з лета 1942 г. і да поўнага вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Складанне такіх карт з вызначанай перыядычнасцю стала магчымым пасля ўстанаўлення трывалай авія-, радыё- і часам кур'ерскай сувязі барацьбітоў у тыле ворага з «Вялікай зямлёй». Станаўленне такой сувязі ішло паралельна з удасканаленнем арганізацыйнай структуры партызанскага руху на працягу 1942 г. Разам з тым на гэтых картах можна ўбачыць толькі тыя фарміраванні, якія прызнавалі савецкую ўладу і дзейнічалі ў адпаведнасці з рашэннямі ваенна-палітычнага кіраўніцтва СССР. Падраздзяленні Арміі Краёвай і іншыя нацыяналістычныя фарміраванні, якія змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, але не падпарадкоўваліся савецкаму кіраўніцтву, на гэтых картах не паказаны. Пэўную цяжкасць пры рабоце з гэтай групай дакументаў стварае тое, што партызанскія фарміраванні тут падпісаны амаль заўсёды не паводле афіцыйных назваў, а па прозвішчах камандзіраў. Нягледзячы на гэтыя недахопы разгледжаныя картаграфічныя дакументы з'яўляюцца адзінай крыніцай, дзе дыслакацыя партызанскіх фарміраванняў паказана адразу на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Брюханов, А.И. В штабе партизанского движения / А.И. Брюханов [лит. обработка В.А. Брюханова]. – Минск : Беларусь, 1980. – 256 с.
2. Калинин, П.З. Партизанская республика / П.З. Калинин [лит. запись Н.В. Бакаева]. – М. : Воениздат, 1964. – 336 с.
3. Паведамленне // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 1450. – Воп. 1. – С. 2. – Л. 222, 254.
4. Указанне па запаўненню форм № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7 табеля тэрміновых данясенняў // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 1. – С. 1. – Л. 10б.
5. Указанне па запаўненню форм № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7 табеля тэрміновых данясенняў // НАРБ. – Фонд 1450. – Фонд. 1450. – Воп. 1. – С. 1. – Л. 12.
6. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944) : Краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А.Л. Манаенков [и др.] – Минск : Беларусь, 1983. – 765 с.
7. Карта // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 24. – С. 42.
8. Карта // НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 33а. – С. 673. – Л. 4.
9. Карта // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 24. – С. 188.
10. Карта // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 24. – С. 189–191.

11. Карта // НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 33а. – С. 676. – Л. 8, 10.
12. Карта // НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 33а. – С. 673. – Л. 5, 3.
13. Карта // НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 33а. – С. 673. – Л. 4.
14. Карта // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 3. – С. 45. – Л. 5.

***Lukashov A.A.*** **Dislocation of Partisan Formations in Belarus during the Great Patriotic War on Cartographic Documents of the National Archives**

Mapping document value of dislocation of the partisan groups operating on the territory of Belarus in the 1941s–1944s is examined, and .the main funds, which contain artifacts of this type, are given. The content dislocation maps that were made in the operations department of the Belarusian Headquarters of Partisan Movement are considered. The instructions, which were worked out in the Central Headquarters of Partisan Movement and which provide a system of graphical symbols needed for the compilation of dislocation maps are quoted. The brief description of printed maps that were used for hand-written information related to the placement of the guerrilla forces is given.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 8.11.2001